УДК 808.26 – 313. 1 «15» XVI ст.

В.М. Пішчулёнак

Структурная арганізацыя мужчынскіх асабовых імён жыхароў Віцебшчыны XVI ст.

Антрапанімія ў кожнай мове з'яўляецца адной з асноўных частак моўнай і гісторыка-культурнай спадчыны таго народа, якому яна належыць. Сістэмы імён складваюцца гістарычна і таму не застаюцца непахіснымі. Адна сістэма выціскае другую, гэта можа праходзіць павольна, як працэс нават непрыкметны для сучаснікаў і бачны толькі ў перспектыве часу, а можа праходзіць і адносна хутка – у перыяды буйных гістарычных пераломаў.

Асноўная роля ў антрапанімнай сістэме, якая фарміравалася ў XVI ст., належыла асабоваму імені. Яно і стала першаэлементам сістэмы іменавання, першым па часе ўзнікнення сродкам вылучэння асобы чалавека ў грамадскім асяроддзі, таму ў нашым даследаванні ўвага звяртаецца на мужчынскія асабовыя імёны.

У якасці асноўнага матэрыялу мы выкарыстоўвалі даныя «Беларускага архіва» [1]. У другім томе змешчана XVI кніга запісаў Літоўскай метрыкі, у якой знаходзяцца «Акты Віцебскага і Полацкага гродскіх судоў» за 1530-1539 гг., напісаныя кірыліцай на старабеларускай мове.

У XVI ст. спрадвечныя славянскія імёны паступова выціскаюцца кананічнымі імёнамі, якія праходзяць працэс фанетычнай, марфалагічнай і словаўтваральнай адаптацыі. У гэты перыяд некаляндарныя імёны яшчэ выступаюць у функцыі асабовага імя, бо выхад іх з выкарыстання характарызуецца сацыяльнай асінхроннасцю. Вялікую колькасць неканонічных імён антрапанімікона Віцебшчыны XVI ст. можна патлумачыць тым, што геапалітычнае становішча разглядаемай тэрыторыі характарызуецца перакрыжаваннем шляхоў з захаду на ўсход і з поўначы на поўдзень. Гэта прывяло да таго, што ў склад антрапанімікона пачалі ўваходзіць разам з кананічнымі імёнамі імёны балтыйскія, паўднёваславянскія (Болошъ, Матыас, Ольбрахт, Войцех). Этымалогія і такіх імён, і кананічных была незразумелая, таму і захоўваліся спрадвечныя імёны.

Антрапанімікон Віцебшчыны XVI ст. на 69% складаюць кананічныя імёны (117 імён праваслаўнага календара, 28 антрапонімаў, кананізаваных і праваслаўнай і каталіцкай царквой, 48 імён каталіцкага календара). 31% складаюць некаляндарныя антрапонімы.

У выніку фанетычна-марфалагічных працэсаў утварыліся поўныя размоў-

на-бытавыя формы і варыянты імён, якія выкарыстоўваліся паралельна з традыцыйна-царкоўнымі. Традыцыйна ад аднаго імя ўзнікала па некалькі размоўных форм і варыянтаў. Формы імён, як правіла, утвараліся ў выніку марфалагічных змен. Варыянты ж з'яўляліся ў выніку мінімальных фанетычных адхіленняў у структуры самога імя. Крыніцы сведчаць, што адны з варыянтаў сустракаюцца спарадычна, а другія выкарыстоўваюцца часта. Апошнія з цягам часу замацаваліся ў якасці асноўнай формы імя на тэрыторыі Віцебшчыны. Самую вялікую колькасць варыянтаў, як паказваюць даследаваныя крыніцы, мелі імёны *Василий, Григорий, Иван, Михаил, Николай*. Неаднолькавая і ўжывальнасць форм імён. З агульнай колькасці мужчынскіх асабовых імён найбольш распаўсюджанымі з'яўляюцца *Иван – 12%, Василий – 4,6%, Михаил – 4,6%, Федор – 4%, Григорий – 3,8%, Семен – 3,5%, Петр – 2,8%, Павел – 2,4%, Юрий – 2%*. Разам з тым у дакументах зафіксаваны імёны, выкарыстанне якіх абмяжоўваецца 1-2 разамі. Яны складаюць 51% ад агульнай колькасці мужчынскіх асабовых імён. Прыкладамі такіх імён могуць служыць наступныя: *Адам, Антип, Арон, Влас, Гурий, Иов, Лукьян, Никодим, Овдей, Созон*.

Рэдкасць ужывання некаторых груп імён у Віцебскіх і Полацкіх актах можна патлумачыць тым, што выбар імя ў мінулым вызначаўся календаром, у якім адны імёны на працягу года сустракаліся толькі 1-2 разы (*Агафон*), іншыя – ад 12 да 79 разоў (*Андрей, Иоанн*). Паўплывалі на колькасць кананічных імён у актах і тыя абставіны, што туды траплялі асобы і не пад традыцыйнымі імёнамі, а пад імёнамі-мянушкамі (*Зуб, Казачок, Лось, Кощей, Некраш, Волк, Воробей*).

З боку марфалагічнай будовы невытворныя імёны могуць быць размежаваны па фіналях «галосны + зычны» і «група зычных».

З фіналлю -ей выкарыстоўваліся імёны, якія ўзыходзяць да традыцыйна-царкоўных на -ей: *Варфаламей, Ворсонофей, Еремей, Кирдей, Матвей, Моисей, Тимофей: Ворсонофей Кожъчичъ (БА,II,357), Еремей Гришинъ (БА,II,178). Кирдей Грычынавичъ (БА,II,27), Матфей Жуковъ (БА,II,146), Матей Войтеховичъ Мерзвенъский (БА,II,45), Моисей (БА,II,334), Тимофей Митьковичъ (БА,II,2)*.

У групу імён з фіналлю -ей таксама перайшлі імёны, кананічныя формы якіх характарызаваліся фіналямі -ий, -ия, -ин, -иан.

Фіналь -ей набылі імёны, якія ўзыходзяць да традыцыйна-царкоўных на -ий: *Авдий – Овдей , Алексий – Алексей / Олексей, Антоний – Антонофей, Василий – Василей, Григорий – Григорей, Дмитрий – Дмитрей, Евсевий – Осей, Евстафий – Остахей, Мокий – Мокей, Сергий – Сергей, Юрий – Юрей: ѡвдей (БА,II,60), Алексей Куровичъ (БА,II,48), ѡлексей Просёлок (БА,II,220), попъ Антонофей (БА,II,357), Василей Квасило (БА,II,97), Григорей IАцъковичъ (БА,II,195). Дмитрей Романовичъ Виденицький (БА,II,195), ѡсей Старый (БА,II,41), ѡстахей Рогозичъ (БА,II,173), Мокей Кузнецовъ (БА,II,300), Серъгей (БА.II.53), Юрей Волчъковичъ (БА,II,146)*.

З фіналю –ей ужываецца імя *Евдоким – Овдокей: ѡвъдокей (БА,II,57)*, якое ўзыходзіць да традыцыйна-царкоўнага на -им.

Некаторыя з імён зафіксаваны даволі часта: *Тимофей, Василей, Охромей < Ефремий, Матвей, Григорей, Дмитрей*. Другія імёны больш абмежаваны ва ўжы-ванні: *Ворфоломей, Ворсонофей, Овдей, Антонофей, Осей, Остахей < Евстафий, Сергей, Овдокей* (удзельная вага складае менш за 1% ад агульнай колькасці імён).

Імёны з фіналлю -ий узыходзяць да двух тыпаў кананічных імён (традыцыйна-царкоўных і тых, што ўтварыліся ад форм з фіналлю –ия): *Василий, Евстафий – Остафий, Юрий: Василий Коптевичъ (БА,II,64); ѡстафий Корсаковичъ (БА,II,160), Юрий Юръевичъ Бомриновичъ (БА,II,45), Анания – Онаний: ѡнаний (БА,II,242)*.

Практычна ні адно традыцыйна-царкоўнае імя на -ий не зарэгістравана толькі ў класічнай форме. У выніку адаптацыі кананічных форм і ўзаемадзеяння розных мадэлей частка імён на -ий набыла іншыя фіналі. Для кожнага канкрэтнага імені ўласціва поўная ці частковая змена мадэлі. Пры поўнай імя пераходзіць у новую мадэль, а пры частковай суіснуюць варыянты, аформленыя па новай мадэлі, і традыцыйныя. Так, 10 імён канчаткова перайшлі ў мадэль з фіналлю -ей і з -ий больш не ўжываюцца: *Овдей, Алексей (Олексей), Антонофей, Григорей, Дмитрей, Осей* < *Евсевий, Остахей* < *Евстафий, Охрамей* < *Ефремей, Мокей, Сергей.* Фіналь «галосны + зычны» набылі кананічныя формы *Авраамий, Артемий, Власий, Ефремий, Игнатий, Кондратий, Макарий.* Ёсць выпадкі, калі на месцы традыцыйных імён ужываюцца нават два новыя варыянты. Кананічная форма Антоний перайшла ў мадэль з фіналлю -ей і «галосны + зычны». Гэта значыць, што з выкарыстаных 28 імён, традыцыйна-царкоўная форма якіх заканчваецца на -ий, 21 поўнасцю перайшло ў іншыя мадэлі: 10 – у мадэль на -ей, 10 – у мадэль з канцавымі «галосны + зычны», 1 – у абедзве мадэлі.

Адзначана суіснаванне форм з фіналямі -ий і -ей ад кананічнага *Юрий*, форм з фіналямі -ий, -ей і «галосны + зычны», «група зычных» ад кананічных *Василий, Григорий, Дмитрий, Евстафий* і інш. З іншых структур у мадэль з фіналлю -ий перайшло імя *Онаний* < *Анания*.

Для імя *Николай* ужываецца форма з фіналлю -ай: *Миколай Тяпинъский (БА,II,290).*

Колькасна невялікая група імён з фіналлю -ия: *Анания – Ананья, Захария – Захарья, Илия – Илья – Ылья: Ананья (БА,II,13), Захарья шсеевичъ (БА,II,120), Ылья Занковъ (БА,II,311).*

Кананічныя формы *Исаия, Малахия* зусім не сустракаюцца, яны перайшлі ў іншыя мадэлі – з фіналямі -а, «зычны гук».

Група імён з фіналлю –а ўзыходзіць да кананічных з канцавым -а, «галосны + зычны» і з фіналлю -ай: *Иуда – Юда, Косма, Козма – Кузьма, Кузма, Лука, Никита – Микита, Савва – Сава, Фома – Хома: Юда с Озерыщ (БА,II,27), Кузьма Селезнева (БА,II,95), Селедецкий Кузма Ермолычъ (БА,II,378), Лука Кононовъ сынъ (БА,II,18), Микита шпонасовъ (БА,II,199), Сава Леоновъ Топорничъ (БА,II,61), Хома Андреевичъ (БА,II,3); Ермолай – Ермола, Минай – Мина, Миколай – Микула: Ермола Ивановъ сынъ (БА,II,15), Мина Лучина (БА,II,312), Микула Хрещовъ (БА,II,327).*

Імя Павел, як правіла, ужываецца ў форме з фіналлю –а *Павла:Павла Юрьевичъ(БА,II,129).*

На аснове кананічных з канцавым -ил і са збегам зычных узніклі імёны з фіналямі -о і -а: *Гавриил – Гаврыло, Гаврило, Даниил – Данило, Мануил – Мануйло, Михаил – Михайло, Михайла: Гаврыло Щука (БА,II,223), Гаврило (БА,II,318); Данило Дуловъ (БА,II,97), Мануйла Волькошовъ (БА II,21), Михайло Курейшовъ (БА,II,146).*

У працэсе адаптацыі кананічная форма Карнилий у выніку страты фіналі -ий па структуры аб'ядналася з групай імён, якія мелі фінал -ил, і разам з імі набыла варыянты з фіналямі -о і -а: *Карнилий – Корнил – Карнило, Корнило: Карънило IАкубовъ сынъ (БА,II,326), Корнило Пилиповъ (БА,II,311).*

Мадэль імён з канцавымі «галосны + зычны», «спалучэнне зычных» у працэсе адаптацыі яшчэ да XVI ст. значна пашырылася за кошт новых імён, утвораных шляхам знікнення канцавых -ий, -ей, -ия. Пісьмовыя крыніцы засведчылі шырокае ўжыванне такіх імён: *Антоний – Онтон, Артемий – Артем – Ортем, Афанасий – Опонас, Василий – Василь, Власий – Влас, Григорий – Грыгор, Дмитрий – Дмитр: Артемъ Ломотъ (БА,II,338), шрътемъ Котовичовъ (БА,II,121), шнътонъ Лотовъ (БА,II,203), шпонас*

Лотовъ (БА,II,247), Василь с Озерищ (БА,II,27), Власъ Василевичъ (БА,II,101), Грыгоръ Скобеевичъ (БА,II,267), Дмитр Лонгвиновичъ (БА,II,31); Климентий – Клим, Лаврентий – Лаврын: Клим Ловейковичъ (БА,II, 308), Лаврын Ивановичъ (БА,II, 371); Исаия – Исай : Исай Буловъ (БА,II, 179).

Пэўную групу складаюць каталіцкія імёны і іх варыянты з фіналямі «галосны + зычны» і «збег зычных». Носьбітамі якіх, магчыма, былі прадстаўнікі каталіцкага веравызнання: *Войцех – Войтех, Матиас – Матыас, Ольбрехт – Ольбрахт, Себастьян – Собестыан, Степан – Стефан, Якуб – Якуб: Войтех Сологубовичовъ (БА,II,22), Матыас Дорнека (БА,II,121), ѡльбрахтъ Мартиновичъ Кашталтъ (БА,II,213), Собестыанъ (БА,II,391), Стеѳанъ (БА,II,80), IАкуб Пивоварецъ (БА,II,120).*

З польскай мовы таксама былі запазычаны імёны з фіналлю -аш, якія адпавядаюць лацінскім на -а і суадносяцца з кананічнымі праваслаўнымі імёнамі на -а, і імёны з фіналлю -уш: *Лука – Лукаш: Лукаш Микуличъ (БА,II,60); Иван – Януш: IАнушъ Костевичъ (БА,II,62).*

Улічваючы спарадычнасць ужывання ў пісьмовых крыніцах каталіцкіх імён з фіналямі «галосны + зычны» і «збег зычных», можна лічыць, што на тэрыторыі Віцебшчыны яны амаль не выкарыстоўваліся. Такога рода імёны сустракаюцца ў дакументах рэдка, яны складаюць 0,17% ад агульнай колькасці вызначаных імён і 0,06% ад агульнай колькасці носьбітаў.

Аналізуючы ўласныя асабовыя імёны ў дакументах «Беларускага архіва», мы прыходзім да высновы, што ў той час побач з поўнымі традыцыйна-царкоўнымі і размоўна-бытавымі формамі, якія мелі нейтральнае значэнне, шырока выкарыстоўваліся імёны з памяншальна-ласкальнымі і павелічальнымі суфіксамі. Генетычна гэта эмацыянальна-ацэначныя формы імён, але, відаць, у той час многія з іх ужываліся ў якасці нейтральных размоўна-бытавых імён, а некаторыя нават набылі патранімічнае значэнне.

Ужыванне эмацыянальна-ацэначных форм у нейтральным значэнні галоўным чынам абумоўлена дзвюма прычынамі: неабходнасцю дыферэнцыраваць асоб з аднолькавым афіцыйным імем і патрэбнасцю характырыстыкі індывідуальных прыкмет асобы.

Эмацыянальна-ацэначныя формы ўжываліся і ў якасці «аднаго са сродкаў сацыяльнай стылістыкі» [2]. Памяншальную форму імён выкарыстоўвалі прадстаўнікі прывілеяваных колаў у адносінах да асоб залежных ці ніжэй стаячых на сацыяльнай лесвіцы; у памяншальнай форме ўжывалі сваё імя пісцы ў тэкстах запісаў і подпісах, прасіцелі, якія звярталіся да асобы, што займала ў грамадстве больш высокае становішча: «Жаловалъ намъ воевода Подляшъский маръшалокъ господаръский панъ Иванъ его милость Богдановичъ Сопега на слугу панцырнаго Ивашку...» (БА,II,117), «Жаловалъ намъ воевода Подляшъский маръшалокъ господаръский панъ Иванъ его милость Богдановичъ Сопега на мещанина господаръского Витебского ѡтрошка...» (БА,II, 119).

Ацэначныя формы з'яўляюцца вытворнымі не толькі ад поўных каляндарных імён (*Глебко< Глеб, Левонька< Левон, Богданец< Богдан, Демидец< Демид*), поўных размоўна-бытавых (*Остапко: Остап < Евстафий, Опанаська: Опанас < Афанасий*), але і ад усечаных, якія атрымалі шырокае распаўсюджанне ў гутарковай *мове* (*Грицко: Гриц < Григорий, Лецко: Лец < Левон*).

Пры ўтварэнні такіх орм адны з фармантаў былі больш ужывальным (-ко/-ка, -шко / -шка, -ш-, -ц), другія – малапрадуктыўнымі (-ечка/-ачка, -ёк/-ок, -хно/-хна, -л-), трэція – адзначаны ў адзіным выпадку: -ок (*Дашок*), -ак (*Ермак*), -юк (*Овсюк*), -н/-н' (*Грын, Грынь*), -с' (*Стась*), -ата (*Климята*), -яй- (*Митяй*), -уш (*Януш*).

Сярод старажытных ацэначных фармантаў фармант -ко/-ка ў колькасных адносінах з'яўляецца найбольш прадуктыўным. З яго дапамогай утвараецца

64 ацэначныя формы і варыянты ад 47 імен. Прадуктыўнасць яго на працягу значнага адрэзку часу тлумачыцца шырокімі магчымасцямі ўступаць у адносіны з іншымі фармантамі.

Л.М. Селішчаў [3] лічыць, што суфікс -ко//-ка ў старажытнасці быў вядомы ўсім славянскім мовам. Ён шырока выкарыстоўваўся для ўтварэння памяншальных форм ад назоўнікаў жаночага роду. У слоўніках, што ўключаюць лексіку пазнейшага часу, колькасць памяншальных форм назоўнікаў з суфіксамі -ка нязначная. У сучаснай беларускай мове адзінкавыя назоўнікі мужчынскага роду з памяншальна-ласкальным значэннем утвораны суфіксам -ка (верабейка, салавейка). Пашыраны суфікс -ка менавіта сярод назоўнікаў жаночага роду.

Эмацыянальна-ацэначныя формы з гэтым суфіксам зафіксаваны ад многіх ужывальных у той час імён праваслаўнага і каталіцкага календара. Яны ўтвараліся ад поўных ці ўсечаных традыцыйна-царкоўных і размоўна-бытавых форм імені, але часцей афармляліся ўсечаныя асновы (75%). У большасці выпадкаў і ў поўных і ва ўсечаных асновах цвердасць-мяккасць апошняга зычнага захоўвалася. Аднак адзначаны выпадкі ацвярдзення мяккага зычнага ці змякчэння цвёрдага, у выніку чаго ўзніклі дублеты з парнымі цвёрдым/мяккім зычнымі [н]-[н'], [с]-[с'], [д]-[д']: *Іванка-Іванька, Грыдко-Грыдько, Васко-Васько.*

У частцы прыведзеных дублетных форм канцавы зычны ўтваральнай асновы мяккі: *Бол'(еслав)+ко, Вас'(илий)+ко, Влад'(имир)+ко, Леон'(ид)+ко, Стан'(ислав)+ко,* а ў другой – цвёрды: *Горасим+ко, Глеб+ко, Даниил+ко, Зен(он)+ко, Іван+ка, Макар+ка.*

Ад утваральных асноў на [х] і на [ф], які змяняецца на [х], [хв], дэрывацыя ажыццяўляецца пры ўдзеле суфікса -ько, у выніку чаго адбываецца чаргаванне х//ш і на стыку асновы і суфікса ўзнікае гукавы комплекс шко//шка. Так узніклі формы *Олтушко, Юшко, Малашка, Отрошко, Мишка, Мишко, Мышко.*

Для ўтварэння эмацыянальна-ацэначных форм імён выкарыстоўваліся і запазычаныя фарманты: літоўскі суфікс -еля < elis *(Петреля)* і фармант -ыас (*Матыас*), які генетычна паходзіць ад канчатка назоўніка мужчынскага роду назоўнага склону.

У дакументах адна і тая ж асоба ў адным выпадку можа называцца поўным імем, а у другім – імем у эмацыянальна-ацэначнай форме. Тлумачыцца гэта тым, што ў залежнасці ад абставін у судовыя запісы маглі трапляць розныя формы імя: *Селедецкий Кузма Ермолыч – Куземька, Петр Колесник – Петреля.*

Некаторыя эмацыянальна-ацэначныя формы замацаваліся за пэўнай асобай у якасці асноўнай формы імя для размежавання асоб з аднолькавымі каляндарнымі імёнамі. У сувязі з гэтым эмацыянальна-ацэначныя формы ў большасці выступаюць у нейтральным значэнні.

Нягледзячы на агульнасць і паслядоўнасць ва ўтварэнні ацэначных форм, кожнае імя – гэта непаўторная мадэль. Пры ўтварэнні ацэначных форм назіраецца вольнасць, адхіленне ад тых узораў, што былі выпрацаваны ў мове.

Такім чынам, у працэсе ўзаемадзеяння розных мадэлей і ў працэсе фанетычнай і марфалагічнай адаптацыі кананічныя імёны зазналі значныя змены у выніку чаго склалася даволі ўстойлівая структура ўласных асабовых імён. Па марфалагічнай будове імёны групуюцца ў тыя ж мадэлі, што і традыцыйна-царкоўныя формы: -ей, -ий, -ай, -ой, -ия, -а, «галосны +зычны», «група зычных», але назіраецца змяненне ступені прадуктыўнасці асобных мадэлей, пераліванне імён з адной мадэлі ў другую.

ЛІТАРАТУРА

1. ***Беларускі** архіў*. Т.II. Мн.: Інбелкульт, 1928. - 343 с.

2. ***Бірыла М.В.*** Беларуская антрапанімія. 1. Уласныя імёны, імёны-мянушкі, імёны па-бацьку, прозвішчы. Мн: Навука і тэхніка, 1966. - 412 с.
3. ***Селищев А.М.*** Происхождение русских фамилий, личных имен и прозвищ // Избранные труды. М.: Просвещение, 1968. С. 97-128.

S U M M A R Y

The article is dedicated to the study of formatina the system of man's own names. The complete official, colloquial and diminutive emotionally estimated variants of man's names are considered on the actual material.

Поступила в редакцию 17.03.2000